Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
______________Ю. П. Бондар
«___» ___________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ___/ баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛОГІКА

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. І. Бабко,* дацэнт кафедры філасофіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філасофскіх навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*М. В. Анцыповіч,* дацэнт кафедры філасофскіх вучэнняў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», кандыдат філасофскіх навук, дацэнт;
*І. М. Вpановіч,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* філасофіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 29.03.2013 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2014 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. І. Бабко

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Логіка» з’яўляецца дысцыплінай спецыялізаванага модуля па выбары студэнта. Дадзеная дысцыпліна вывучалася ў еўрапейскіх універсітэтах на працягу ўсяго іх гістарычнага існавання. І ў сучасных умовах яна застаецца неад’емным кампанентам дысцыплінарнай структуры вышэйшай адукацыі (і не толькі вышэйшай – дадзеная навука прадстаўлена таксама на іншых ступенях адукацыйнага працэсу). Гэта тлумачыцца яе грунтоўным значэннем, якое выяўляе шэраг аспектаў. У тэарэтычным плане надзвычай важна, што логіка, апісваючы і аналізуючы структуру чалавечых разваг, ахоплівае і апісвае неад’емны ў сваёй грунтоўнай значнасці сегмент духоўнай рэчаіснасці і спрыяе такім чынам пашырэнню ведаў чалавека пра яго самога і паглыбенню ягонага самаразумення. Разам з тым фармальная логіка мае істотны метадалагічны патэнцыял, авалоданне якім павінна паспрыяць павышэнню эфектыўнасці вучэбнай працы студэнтаў, падрыхтоўцы іх да вядзення самастойных навуковых даследаванняў і да будучай прафесійнай дзейнасці. Акрамя таго, лагічная культура асобы істотным чынам уплывае на яе камунікатыўныя навыкі і ўменні. А паколькі гэты кампанент яе агульнай культуры не можа развіцца без грунтоўнага вывучэння логікі, таму дадзеная дысцыпліна выяўляецца як надзвычай важная ў згаданым кантэксце.

*Мэта* дысцыпліны – развіццё мыслення студэнтаў і ўзбагачэнне яго метадалагічнага патэнцыялу.

Для дасягнення дадзенай мэты неабходна вырашыць наступныя асноўныя *задачы:*

– забяспечыць засваенне студэнтамі найважнейшых лагічных форм, законаў і аперацый;

– сфарміраваць у іх навыкі творчага ўжытку законаў логікі ў самых разнастайных сферах грамадскага жыцця і найперш у сферы сваёй будучай прафесійнай дзейнасці;

– забяспечыць авалоданне студэнтамі метадалагічнага патэнцыялу логікі;

– сфарміраваць у іх навыкі лагічнага аналізу пэўнай пазнавальнай сітуацыі і прыняцця адпаведных ёй метадычных рашэнняў.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– асноўныя палажэнні логікі і яе мову;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сутнасць, віды і прычыны лагічных памылак;

– патрабаванні да вядзення дыскусій, да пытанняў і адказаў, да аргументацыі;

– асноўныя этапы гістарычнага развіцця логікі і асаблівасці сучаснага стану даследаванняў у яе сферы.

Студэнты павінны *ўмець:*

– распазнаваць, ідэнтыфікаваць і характарызаваць найважнейшыя лагічныя формы;

– весці лагічны аналіз вынікаў сваёй вучэбнай і навуковай дзейнасці, тэкстаў і разважанняў іншых пазнавальных сітуацый, дыскусій, спрэчак, пісьмовай і вуснай палемікі;

– ужываць характэрную для логікі тэрміналогію;

– аргументавана і пераканаўча выказваць свой пункт гледжання;

– пазбягаць лагічных памылак, выяўляць, ідэнтыфікаваць і пераадольваць іх, калі яны ўсё ж такі былі дапушчаны;

– раскрываць супярэчнасці і хібы ў развагах іншых, выяўляючы пры гэтым шляхі іх пераадолення.

Студэнты павінны *валодаць*:

– разуменнем сацыяльнай значнасці і культурнай каштоўнасці ведаў у галіне логікі ў кантэксце працэсаў, што адбываюцца ў сучасным беларускім грамадстве;

– працэдурамі лагічна-метадалагічнага аналізу і ацэнкі інфармацыйных паведамленняў, прапаноў і праектаў;

– навыкамі самаадукацыі і павышэння кваліфікацыі ў галіне логікі;

– навыкамі планавання і арганізацыі сталай навукова-даследчай дзейнасці;

– метадамі выкарыстання набытых у працэсе вывучэння дысцыпліны ведаў пры рашэнні прафесійных задач і выкананні сацыяльных функцый.

Дысцыпліна спецыялізаванага модуля «Логіка» разлічана ўсяго на 72 гадзіны, 34 з іх аўдыторныя (26 гадзін адведзена на лекцыі і 8 – на семінарскія заняткі). Рэкамендуемая форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | семінары |
| Уводзіны | 2 | |
| *Тэма 1*. Прадмет і значэнне логікі | 2 | |
| *Тэма 2*. Імёны | 4 | 2 |
| *Тэма 3*. Выказванні | 4 | 2 |
| *Тэма 4*. Сілагістычныя высновы | 4 | 2 |
| *Тэма 5*. Недэдуктыўныя (імаверныя) высновы | 2 | |
| *Тэма 6*. Мадальнасці | 2 | |
| *Тэма 7*. Законы логікі | 2 | |
| *Тэма 8*. Логіка і зносіны | 4 | 2 |
| **Усяго…** | **26** | **8** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Логіка як вучэбная дысцыпліна, яе мэты і задачы. Грунтоўныя праблемы, звязаныя са структурай агульназначных разваг, як праблемнае поле курса. Законы і правілы карэктных развважанняў як яго асноўны змест. Тэарэтычнае і практычнае значэнне логікі для спецыяліста-гуманітарыя. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны.

*Тэма 1. Прадмет і значэнне логікі*

Спецыфіка лагічнай ступені пазнання. Паняцце лагічнай формы. Мова логікі. Лагічныя памылкі і іх класіфікацыя. Логіка і творчасць. Значэнне логікі. Гісторыя логікі.

*Тэма 2. Імёны*

Праблема наймення. Аб'ём і змест як асноўныя характарыстыкі імя. Паняцце прымет. Класіфікацыя імён паводле аб'ёму і зместу. Адносіны паміж імёнамі. Аперацыі з імёнамі паводле аб'ёму і зместу. Імя і паняцце.

*Тэма 3. Выказванні*

Простыя і складаныя выказванні. Класіфікацыя простых выказванняў. Атрыбутыўныя выказванні і іх структура. Кольксасць і якасць атрыбутыўных выказванняў. Класіфікацыя атрыбутыўных выказванняў паводле колькасці і якасці. Размеркаванасць тэрмінаў у атрыбутыўных выказваннях. Лагічныя адносіны паміж формамі атрыбутыўных выказванняў. Лагічны квадрат. Паняцце лагічнага злучніка. Таблічны і графічны спосабы выяўлення лагічных значэнняў складаных выказванняў. Класіфікацыя складаных выказванняў. Адносіны паміж лагічнымі формамі выказванняў. Законы дэ Моргана. Дэдуктыўныя высновы ў логіцы выказванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Сілагістычныя высновы*

Паняцце сілагістыкі. Класіфікацыя высноў. Непасрэдныя сілагістычныя высновы. Высновы паводле лагічнага квадрата; абверсія, канверсія, контрапазіцыя. Асноўнае правіла непасрэдных сілагістычных высноў. Апасродкаваныя сілагістычныя высновы. Паняцце простага катэгарычнага сілагізму, яго структура. Пасылкі і выснова. Паняцце тэрміна. Крайнія (меншы, большы) і сярэдні тэрміны. Паняцце правільнага сілагізму. Асноўныя правілы простага катэгарычнага сілагізму. Фігуры простага катэгарычнага сілагізму і іх правілы. Паняцце модуса. Складаныя сілагізмы. Скарочаныя сілагізмы.

*Тэма 5. Недэдуктыўныя (імаверныя) высновы*

Паняцце недэдуктыўных высноў. Праблема індукцыі і яе роля ў гісторыі філасофіі і логікі. Непасрэдныя недэдуктыўныя высновы. Апасродкаваныя недэдуктыўныя высновы. Аналогія, яе структура. Паняцце мадэлі і прататыпу (арыгінала). Адносіны ізамарфізму і гомамарфізму паміж мадэллю і прататыпам як аснова адназначных, неабходных высноў паводле аналогіі. Ужыванне высноў паводле аналогіі ў розных сферах чалавечай дзейнасці. Рэдукцыя як разнавіднасць недэдуктыўных высноў. Індукцыя як від рэдукцыі. Індукцыя поўная і няпоўная, простая і навуковая. Хібы ў недэдуктыўных высновах. Умовы павышэння імавернасці недэдуктыўных высноў.

*Тэма 6. Мадальнасці*

Паняцце мадальнасці выказвання. Мадальныя функтары і іх віды. Мадальнасці: алетычная (анталагічная і лагічная), аксіялагічная, дэантычная, эпістэмічная. Ужыванне мадальнай логікі ў розных галінах чалавечай дзейнасці.

*Тэма 6. Законы логікі*

Асноўныя прынцыпы і законы класічнай логікі. Прынцып несупярэчнасці і лагічныя парадоксы. Прынцыпы класічнай логікі і іх асноватворная роля ў заходняй культуры. Асаблі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

васці іх рэалізацыі ў цывілізацыях Усходу. Праблема ўзаемадачыненняў дыялектычнай і фармальнай логікі.

*Тэма 7. Логіка і зносіны*

Сутнасць і віды дыялогу, яго структура. Лагічнае ядро і перыферыя дыялогу. Пытанне як форма думкі. Структура пытання. Класіфікацыя пытанняў. Адказ і яго віды. Аргументацыя, яе месца і роля ў структуры дыялогу. Лагічная структура аргументацыі. Аргументацыя і фарміраванне перакананняў. Патрабаванні да вядзення дыялогу. Агульныя патрабаванні. Патрабаванні да пытання, адказу. Паняцце эрыстычнага прыёму. Патрабаванні да аргументацыі (да тэзы, довадаў і дэманстрацыі). Памылкі ў вядзенні дыялогу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


*Асноўная*

*Бабко, А. І.* Логіка : вучэб. дапам. / А. І. Бабко. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – 108 с.

*Бартон, В. И.* Логика : учеб. пособие / В. И. Бартон. – Минск : Новое знание, 2000. – 333 с.

*Берков, В. Ф.* Логика: задачи и упражнения: практикум / В. Ф. Берков. – 3-е изд., стереотип. – Минск : ТетраСистемс, 2002. – 221 с.

*Берков, В. Ф.* Логика: практикум / В. Ф. Берков, И. И. Терлюкевич. – Минск : Технопринт, 2003.– 167 с.

*Берков, В. Ф.* Логика : учеб. пособие для студентов вузов / В. Ф. Берков, Я. С. Яскевич, В. И. Павлюкевич ; под общ. ред. В. Ф. Беркова. – 7-е изд. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 415 с.

История логики : учеб. пособие / В. Ф. Берков, Я. С. Яскевич, С. В. Воробьева [и др.] ; под общ. ред. В. Ф. Беркова, Я. С. Яскевич. – Минск : Новое знание, 2001. – 170 с.

*Свинцов, В. И.* Логика: элементарный курс для гуманитарных специальностей / В. И. Свинцов. – М. : Скорина: Весь мир, 1998. – 351 с.

*Даведачная*

*Горский, Д. П.* Краткий словарь по логике / Д. П. Горский, А. А. Ивин, А. Л. Никифоров ; под ред. Д. П. Горского. – М. : Просвещение, 1991. – 208 с.

*Кондаков, Н. И.* Логический словарь-справочник / Н. И. Кондаков. – М. : Наука, 1971. – 656 с.

*Дадатковая*

*Клини, С. К.* Математическая логика / С. К. Клини ; пер. с англ. Ю. А. Гастева ; под ред. Г. Е. Минца. – М. : Мир, 1973. – 480 с.

*Лакатос, И.* Доказательства и опровержения: как доказываются теоремы / И. Лакатос ; пер. с англ. И. Н. Веселовского. – М. : Наука, 1967. – 152 с.

*Поппер, К.* Логика и рост научного знания: избр. работы / К. Поппер ; пер. с англ., сост., общ. ред. и вступ. ст. В. Н. Садовского. – М. : Прогресс, 1983. – 605 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Яскевич, Я. С.* Аргументация в науке / Я. С. Яскевич. – Минск : Университетское, 1992. – 142 с.

*На замежных мовах*

*Bocheński, J. M.* Formale Logik / J. M. Bocheński. – 5. Aufl. – Freiburg / Műnchen : Karl Alber, 1996. – 648 s. (Бібліятэка інстытута імя І. В. Гётэ*).

*Bühler, A.* Einführung in die Logik: Argummentation und Folgerung / A. Bühler. – Freiburg (Bresgau) ; München : Alber, 1992. – 320 s. (Бібліятэка НАН Беларусі).

*Hodges, W.* Logic / W. Hodges. – Harmondsworth : Penguin Books, 1979. – 331 p. (Нацыянальная бібліятэка Беларусі).

*Joseph, H. W. B.* An Introduction to Logic / H. W. B. Joseph. – 2nd, rev. ed. – Oxford : Clarendon Press, 1961. – 608 p. (Нацыянальная бібліятэка Беларусі).

*Howson, K.* Logic with Trees: An Introduction to Symbolic Logic / K. Howson. – London ; New York : Routledge, 1997. – 197 p. (Навуковая бібліятэка БНТУ).

*Ingarden, R.* Z teorii języka ifilozoficznech podstaw logiki / R. Ingarden. – Warszawa : PWN, 1972. – 508 s. (Бібліятэка НАН Беларусі).

*Klaus, G.* Moderne Logik. Abriss der formalen Logik / G. Klaus. – 5. berichtigte Aufl. – Berlin : Deutscher Verlag der Wissenschaften, 1970. – 425 s. (Бібліятэка НАН Беларусі).

*Kraszewski, Z.* Logika–nauka rozumowania / Z. Kraszewski. – Wyd. 2-e. – Warszawa : PWN, 1977. – 271 s. (Бібліятэка НАН Беларусі).

*Kreyche, R. J.* Logic for Undergraduates / R.J. Kreyche. – New York: Holt, Reinehart and Winston, 1961. – 356 p. (Аддзел замежнай літаратуры абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна).

*Kutschera, F. von.* Die Antinomien der Logik. Semantische Untersuchungen / F. von Kutshera. – München : Verlag Freiburg, 1964. – 107 s. (Бібліятэка НАН Беларусі).

*Markowski, M.* Logika / M. Markowski. – Wrocław : Wyd. PAN, 1975. – 232 s. (Бібліятэка НАН Беларусі).

*Mates, B.* Elementary Logic / B. Mates. – 2nd ed. – New York : Oxford Univ. Press, 1972. – 237 p. (Бібліятэка НАН Беларусі).

*Указваюцца бібліятэкі Беларусі, у якіх можна атрымаць дадзеныя кніжкі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Polska filozofia analityczna: Analiza logiczna i semiotyczna w szkole lwowsko-warszawskiej / Pr. zbior. podred. M. Hempolińskiego. – Wrocław : Ossolineum, 1987. – 295 p. (Бібліятэка НАН Беларусі).

*Quine, W. V.* «The Ways of Paradox» and other Essays / W. V. Quine. – Cambridge ; London: Harvard Univ. Press, 1976. – 335 p. (Нацыянальная бібліятэка Беларусі).

*Quine, W. V.* Philosophy of Logic / W. V. Quine. – 2nd ed. – Cambridge ; London : Harvard Univ. Press, 1986. – 109 p. (Нацыянальная бібліятэка Беларусі).

*Seebohn, T. M.* Philosophie der Logik / T. M. Seebohn. – Freiburg (Breisgau) ; München : Alber, 1984. – 364 s. (Бібліятэка НАН Беларусі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

1) выкананне пісьмовых кантрольных работ (заданняў);
2) вуснае апытанне;
3) тэставыя заданні;
4) выкарыстанне тэкстаў манаграфій і падручнікаў;
5) залік.

## Метадычныя ўказанні па арганізацыі і выкананні СРС

Самастойная работа прадугледжвае вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны і падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў. Студэнты павінны засвоіць тэарэтычны матэрыял, які быў выкладзены на лекцыйных занятках, і прааналізаваць матэрыял, прапанаваны ў спісе літаратуры.

*Вучэбнае выданне*

**ЛОГІКА**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,70. Ул.-выд. арк. 0,35. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ